Источник: "Настаўніцкая газета" - 2016-11-15

# Post mortem. Памяць пасля смерці

**На мінулым тыдні ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Post mortem. Пахавальныя помнікі ў гісторыка-культурнай прасторы: праблемы вывучэння і захавання". На працягу трох дзён (з 9 па 11 лістапада) навукоўцы і спецыялісты Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы абмяркоўвалі актуальныя для гістарычнай навукі пытанні.**

Праблематыка канферэнцыі аб'ядноўвае археолагаў, антрапалагаў, этнографаў, культуразнаўцаў, а таксама настаўнікаў-краязнаўцаў. Менавіта настаўнікі і вучні, асабліва ў сельскай мясцовасці, падтрымліваюць чысціню на брацкіх магілах воінаў-вызваліцеляў, на адзіночных пахаваннях вядомых землякоў. Вывучэнне некропаляў, могільнікаў, пахаванняў — усё гэта адзін з актуальных кірункаў гістарычнай навукі і школьнага краязнаўства.

— Чалавецтва ва ўсе часы хвалявала тэма жыцця і смерці. Людзі заўсёды задумваліся над такімі пытаннямі: ці ёсць жыццё пасля смерці, якія рытуальныя дзеянні неабходна ажыццявіць для пераходу ў іншы свет, якія рэчы павінны суправаджаць памерлага і г.д.? Традыцыя пахавання сваіх суродзічаў з'явілася яшчэ ў каменным веку. Ад пачатку гісторыі людзі асэнсавана хавалі нябожчыкаў, ажыццяўлялі пэўныя рытуальныя дзеянні, прыкладалі значныя намаганні падчас правядзення пахавальнага абраду, узвядзення пахавальных помнікаў. Вывучэнне такіх абрадаў на падставе археалагічных, пісьмовых і этнаграфічных крыніц дае ўяўленне аб дэмаграфіі, этнічных, сацыяльна-эканамічных, палітычных і ідэалагічных працэсах, якія адбываліся ў грамадстве, — паведаміў дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч.

Актуальным застаецца пошук і вывучэнне пахавальных помнікаў, могільнікаў, элементаў пахавальнага абраду і інвентару не толькі першабытнага часу, але і наступных перыядаў і эпох нашай гісторыі. Мы павінны памятаць: усё, што мы сёння маем, чым ганарымся, грунтуецца на працы і жыцці шматлікіх пакаленняў нашых папярэднікаў і продкаў. Памяць пра іх культуру, традыцыі неабходна захоўваць і ўшаноўваць належным чынам.

Па словах Вячаслава Віктаравіча, сёння ад навукоўцаў патрабуецца выкарыстанне сучасных тэхналогій даследаванняў, калі археалагічныя і тапалагічныя метады спалучаюцца з судова-медыцынскай экспертызай. Усё гэта дазваляе вызначыць пол, узрост, магчымыя прычыны смерці індывіда, рэканструяваць фізічныя асаблівасці, стан здароўя, а таксама тып харчавання. Неабходна выкарыстоўваць не толькі класічныя падыходы, але і камп'ютарную тэхніку, неінвазіўныя метады, тэхналогіі малекулярнай біялогіі, хіміі і фізікі.

Калі традыцыйным спосабам (археалагічнымі раскопкамі) настаўнікі і вучні могуць даследаваць пахавальныя помнікі толькі пад кіраўніцтвам навукоўцаў, то сучасныя тэхналогіі дазваляюць праводзіць якасныя даследаванні самастойна без пашкоджання археалагічных аб'ектаў. Адным з такіх спосабаў з'яўляецца 3D-візуалізацыя археалагічнага матэрыялу. Як вядома, знойдзеныя настаўнікамі і вучнямі падчас археалагічных раскопак прадметы адпраўляюцца для далейшага даследавання ў Інстытут гісторыі НАН Беларусі або ва ўніверсітэты, пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў якіх і праводзіліся раскопкі. Пазнаёміць, няхай і завочна, школу са знойдзенымі артэфактамі дазволяць сучасныя тэхналогіі. Так, з дапамогай пэўных праграмных прадуктаў, якія лёгка знайсці ў інтэрнэце, можна візуалізаваць артэфакты, стварыць нават мадэлі курганоў, раскопаў. З выкарыстаннем такіх метадаў работы ўдзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся на прыкладзе даследавання расійскімі навукоўцамі пахавальных помнікаў X стагоддзя на тэрыторыі Гнёздаўскага археалагічнага комплексу.

Тэматыка дакладаў удзельнікаў канферэнцыі, як і тэматыка даследаванняў пахавальных помнікаў, надзвычай шырокая. Гэта і вывучэнне курганных могільнікаў, надмагільных помнікаў розных перыядаў нашай гісторыі, пахаванні на тэрыторыі крэпасцей і храмаў, некропаляў асобных населеных пунктаў, роля могілак у даследаванні вёсак чарнобыльскай зоны і г.д. Як бачым, поле для навуковай, а таксама школьнай краязнаўчай дзейнасці тут даволі шырокае. Даследаванне пахавальных помнікаў дае каштоўныя звесткі па гісторыі, этнаграфіі, сацыяльна-эканамічных працэсах роднага краю.

**Ігар ГРЭЧКА.**
*hrechka@ng-press.by*